«Он видел сына, друга и помощника». Глаголы «продавать», «рассказывать», «сообщать» в арабском языке также обладают двойной переходностью и требуют после себя двух имён в винительном падеже.

В процессе преподавания русского языка в арабской аудитории важно обратить внимание на случаи расхождения в управлении глаголов. Когда переходным глаголам русского языка соответствуют непереходные глаголы арабского языка: «искать» (что?) – «бахаса ’ан» (о чём?), «защищать» (что?) – «дāфа’а ’ан» (о чём?), «побеждать» (кого? что?) «’интасара ’алā» (на что? за что?), «беречь» (что?) – «хāфаза ’алā» (на что?), «захватить» что? – «’интаўалā ’алā» (на что?), «чувствовать» (что?) – «ша’ара би» (с чем?), «обманывать» (кого?) – «казаба ’алā» (на кого?) и некоторые другие. Это приводит к ошибкам в речи арабских учащихся типа: «Народ бережёт за свободу», «Она защищала о диссертации», «Он пошёл к врачу, потому что чувствовал с болью» и тому подобные.

СПИСОК ЛИТЕРАТУРЫ

1. Берников, О.А. Арабская грамматика в таблицах и схемах / О.А. Берников. – М.: Русский язык, 2008 – 144 с.

2. Болотов, В.Н. Арабский язык. Справочник по грамматике / В.Н. Болотов. – М.: Живой язык, 2009 – 224 с.

3. Гранде, Б.М. Курс арабской грамматики в сравнительно-историческом освещении / Б.М. Гранде. – М.: Восточная литература РАН, 1998.

4. Джамиль, Я.Ю. Литературный арабский язык / Я.Ю. Джамиль. – М.: Живой язык, 2006.

5. Ибрагимов, И.Д. Арабский язык / И.Д. Ибрагимов. – СПб: АСТ, 2007 – 256 с.

6. Фролова, О.Б. Мы говорим по-арабски: Учебник / О.Б. Фролов. – М.: Филология, 2002 – 286 с.

## ГРАМАТЫЧНАЯ АБУМОЎЛЕНАСЦЬ ВЫБАРУ НЕКАТОРЫХ ПУНКТУАЦЫЙНЫХ ВАРЫЯНТАЎ.

*Бурак И.Л.*

*Белоруский национальный технический университет*

Варыянтнасць уласціва ўсім узроўням мовы, ад фанетычнага да граматычнага. Для пунктуацыі як састаўной часткі як агульнамоўнай сістэмы таксама характэрны варыянты. Пунктуацыйныя варыянты абумоўлены актуальным чляненнем сказа, камунікатыўнай мэтай паведамлення, змешчанага ў ім.

Аднак наяўнасць у сказе пэўных граматычных умоў можа ўплываць на выбар аднаго канкрэтнага варыянта.1. Так, адасобленныя члены ў сказе

адзяляюцца або выдзяляюцца з дапамогай коскі : “Галлё спусціўшы над парканам, расла тут грушка з тонкім станам (Я.Колас)”; “Паветра , напоенае пахамі хвоі, навісла сіняватай смугай( М.Лынькоў)”. Адасабленне можа набываць узмоцнены характар, і тады адасобленыя члены аддзяляюцца або выдзяляюцца ў сказе з дапамогай працяжніка. Узмоцненае адасабленне вызначаецца сэнсам, які ўкладваецца ў выказванне. Аднак ёсць і пэўныя граматычныя ўмовы, якія прадвызначаюць гэту з’яву: размяшчэнне адасобленых членаў у сказе, іх колькасны склад і развітасць спосаб марфалагічнага выражэння адасобленых членаў сказа, сродкі іх сувязі паміж сабой.

У прыватнасці, адасабленне азначэнняў лічацца ўзмоцненым, калі яны выражаны адзіночнымі прыметнікамі, размешчаны ў канцы сказа і калі іх не менш чым два: “Плывуць па небе хмаркі – белыя, курчавыя (М.Лынькоў)”; “У руках была кветка – белая, пышная, вялікая (Я.Колас) ”.

Набываюць узмоцнены характар адасобленныя азначэнні . выражаныя адзіночнымі прыметнікамі ці займеннікамі, калі яны маюць удакладняльны характар і для іх аб’яднання ўжываецца злучнік “і” (адзін або ў спалучэнні з бязлучнікавай сувяззю): “Гэта наша – тая і мая маладосць (П.Глебка)”; “На дрэвах зімой два колеры – чорны і белы (З.Бядуля)”; “Ішоў асенні – дробны, нудны і доугі дождж (К.Чорны)”.

Узмоцненым з’яўляецца адасабленне неразвітых і развітых недапасаваных азначэнняў , выражаных назоўнікамі ў фомре ўскосных склонаў, калі яны размешчаны ў сярэдзіне сказа пасля дапасаванага азначэння , выражанага прыметнікам, і ўдакладняюць яго сэнс : “Дарога ішла па доўгай – з кілометр – паляне ( М.Лынькоў)”; “ Сакавіты – з поўных грудзей – смех напоўніў пакой (І.Шамякін)”.

З дапамогай працяжніка адасабляюцца недапасаваныя азначэнні, выражаныя інфінітывам, калі яны размешчаны ў канцы сказа і ўжываюцца для ўдакладнення асобых слоў у сказе: “Усіх непакоіла адна думка – выстаяць ( М.Лынькоў)”; “Узнікла недарэчнае ў такіх абставінах жаданне – засмяяцца (І.Сабаленка)”.

Адсобленыя неразвітыя і развітыя прыдаткі, размешчаныя ў канцы сказа, аддзяляюцца працяжнікам, паколькі іх адасабленне набывае ўзмоцнены характар: “Дадому з зімоўкі далёкай ляцяць нашы госці – шпакі (М.Хведаровіч)”; “Пеніцца Нарач – рыбацкае мора (А.Валюгін)”.

Пастаноўка працяжніка пры прыдатках можа быць абумоўлена кампазіцыйнымі асаблівасцямі сказа. У сказах ускладненай будовы адасобленыя прыдаткі заўсёды выдзяляюцца працяжнікамі : “На пагорку, ля самага броду рэчкі, Мацей Тадэўчык – стары рыбак і паляўнічы –

сядзіць на перавернутым чоўне пры слаба тлеючым вогнішчы і дыміць люлькай (З.Бядуля)”.

Калі адасоблены прыдатак адносіцца да аднаго з аднародных членаў, якія выражаны назоўнікамі, то для іх даскладанага размежавання ў сказе гэты прыдатак выдзяляецца працяжнікамі: “Маці, Алімпа – яе сястра і мы збіралі ягады на паляне (Я.Колас); “Андрей, Сцяпан – селянін з суседняй вёскі – і незнаёмая дзяўчына выйшлі на дарагу (П.Пестрак)”. Адасабленне такіх прыдаткаў узмоцненым не з’яўляецца.

Адасобленыя акалічнасці аддяляюцца працяжнікам, калі яны ўдакладняюць або паясняюць іншую акалічнасць у сказе, размешчаны ў канцы сказа і калі іх не менш чым дзве : “Сані рыпяць па-ранішняму – глуха, коратка, непрыветна (Я.Скрыган)”; “Хата пабудавана на вясковы лад – проста і адмыслова (К.Чорны)”.

Адасабленне акалічнасцей з’яўляецца ўзмоцненым, калі яны выражаны інфінітывам або інфінітыўным словазлучэннем, размешчаны ў канцы сказа і аддзелены ад паясняемага выказніка іншымі членамі сказа: “Да Сцёпкі зайшлі хлопцы — пазнаёміцца (Я.Колас)”; “Слава пайшоў у напрамку пасёлка – сустрэць Сцяпана Каваля ( П.Петрак)”.

Узмоцненым з’яўляецца адасабленне аднародных акалічнасцей, калі яны маюць удакладняльны характар і аб’яднаны паміж сабой злучнікамі “і,ці,або”: “Усюды — далёка і блізка – жаданая ява ўстае (П.Броўка)”; “Заўсёды – зімой ці летам – ён хадзіў у цёплай шапцы (М.Лынькоў); “Усюды – на полі, у лесе або дома – ён не сядзеў без работы (З.Бядуля)”.

Прааналізаваны фактычны матэрыял дае магчымасць сцвярджаць, што асноўнымі граматычнымі ўмовамі ўзмоцненага адасаблення з’яўляюцца размяшчэнне адасобленых членаў у канцы сказа, іх удакладнены або паясняльны характар, развітасць, колькасны склад. Пералічаныя граматычныя ўмовы пры пунктуальным афармленні адасобленых членаў сказа прадвызначаюць пастаноўку працяжніка, а не коскі.

## СОВРЕМЕННЫЙ ПОДХОД К ИССЛЕДОВАНИЮ СЕМАНТИЧЕСКОЙ ДИНАМИКИ СЛОВА

*Г.П. Кузикевич*
*Военная академия Республики Беларусь*

Значение слова или (на языке когнитивной семантики) “схваченный” словесным знаком концепт, изначально обладает способностью к динамике. Вербализуя результаты когнитивной деятельности человека,